# ПАНЯЦЦЕ «ЗМЯНЕННЕ АБСТАНОЎКІ» У КАНТЭКСЦЕ СТРАТЫ ДЗЕЯННЕМ ГРАМАДСКАЙ НЕБЯСПЕКІ ЯК ПАДСТАВЫ ВЫЗВАЛЕННЯ АД КРЫМІНАЛЬНАЙ АДКАЗНАСЦІ

**М. С. Жураў**

*mikitazhurau@gmail.com;*
*Навуковы кіраўнік – А. У. Шыдлоўскі,. кандыдат юрыдычных навук, дацэнт*

У артыкуле надаецца ўвага катэгорыі “змяненне абстаноўкі” - канструктыўнаму элементу адпаведнай падставы вызвалення ад крымінальнай адказнасці паводле Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь. Зыходзячы з аналізу дактрынальных крыніц і правапрымяняльнай практыкі, прыводзяцца значэнні, у якіх разумеецца гэта паняцце. Аўтарам зроблены канкрэтныя прапановы па заканадаўчым удасканаленні названай фармулёўкі.

***Ключавыя словы:*** змяненне абстаноўкі; страта грамадскай небяспекі; вызваленне ад крымінальнай адказнасці; падставы вызвалення ад адказнасці; крымінальнае заканадаўства Беларусі.

Крымінальны кодэкс Беларусі сярод агульных падстаў вызвалення ад крымінальнай адказнасці называе ў арт. 87 вызваленне з прычыны страты дзеяннем або асобай грамадскай небяспекі [1]. Яно звязана з прызнаннем страты супрацьпраўным дзеяннем, ажыццёўленым асобай, характару грамадска небяспечнага з прычыны змянення абстаноўкі, а таксама з устанаўленнем таго факта, што сама асоба перастала быць грамадска небяспечнай, і прадугледжвае, што на момант учынення асобай злачынства апошняе з’яўлялася такім па КК і тады за яго было ўстаноўлена пакаранне, але ў далейшым адбыліся нейкія змены, якія зрабілі немэтазгодным прыцягненне асобы да крымінальнай адказнасці.

На нашу думку, пры непасрэдным ужыванні судамі дадзенай нормы ўзнікае шэраг пытанняў, абумоўленых замацаванай у Кодэксе канструкцыяй. Кодэкс не прадугледжвае пералік крытэрыяў, вызначэнне якіх будзе выразна сведчыць аб страце дзеяннем грамадска небяспечнага характару: арт. 87 КК гаворыць толькі аб тым, што павінна мець месца змяненне абстаноўкі. На гэтай падставе ўзнікае пытанне: аб якой абстаноўцы вядзецца гаворка і што ўвогуле мяркуецца пад яе змяненнем?

У крымінальна-прававой навуцы паняцце “змяненне абстаноўкі” разумеецца ў некалькіх аспектах:

гэта такія змяненні, што носяць аб’ектыўны характар і адбываюцца незалежна ад жадання асобы, якая ўчыніла злачынства, у роўнай ступені як і іншых грамадзян (адмена ваеннага або надзвычайнага становішча,

сканчэнне ваенных дзеянняў, правядзенне палітычнай або эканамічнай рэформы ў краіне і інш.);

гэта сітуацыя, пры якой назіраецца адпадзенне асаблівых умоў месца і часу, якія надаюць дзеянню характар грамадска небяспечнага;

такія змяненні могуць закранаць вытворчыя, сямейныя і іншыя адносіны, стан здароўя асобы і г.д. [2].

Такім чынам, змяненне абстаноўкі ў кантэксце страты дзеяннем грамадскай небяспекі тлумачыцца дактрынай у асноўным праз наступленне пэўных глабальных падзей, якія ў корані ўплываюць на жыццё грамадства, дзяржавы. Але магчыма і наступленне абставін, што тычацца ўмоў здзяйснення асобна ўзятага злачынства, па-за залежнасцю ад працэсаў, што закранаюць асновы грамадскага і дзяржаўнага ладу. Як след, паняцце змянення абстаноўкі магчыма тлумачыць у двух накірунках:

1. карэнныя пераўтварэнні ладу жыцця грамадства, яго асобных сфер;

2. спыненне існавання ўмоў здзяйснення асобнага злачынства.

Першы накірунак змянення абстаноўкі – карэнныя пераўтварэнні ладу жыцця чалавечай супольнасці, якія могуць праяўляцца, у прыватнасці, у ажыццяўленні рэформ у розных сферах, станаўленні якасна новага сацыяльна-эканамічнага стану, пераасэнсаванні маральных і рэлігійных норм. Ён цягне наступствы ў выглядзе страты канкрэтным дзеяннем, прадугледжаным КК, грамадскай небяспекі і ў далейшым дэкрыміналізацыю злачынства, г.зн. выключэнне канкрэтнага артыкула, часткі, пункта з тэкста Кодэкса.

Змяненне абстаноўкі ў гэтым сэнсе ўплывае на адзін з элементаў складу злачынства, а іменна аб’ект – тыя грамадскія адносіны, якія ахоўваюцца крымінальным законам. Разам з тым гэтыя адносіны раптоўна могуць спыніць сваё існаванне, змяніцца або страціць той узровень каштоўнасці, які ўласцівы аб’ектам злачынства.

Напрыклад, арт. 150 КК БССР 1960 г. прадугледжваў адказнасць за ажыццяўленне прыватнапрадпрымальніцкай дзейнасці [3]. Замацаванне дадзенага складу злачынства было своеасаблівым працягам канстытуцыйных палажэнняў аб выключнай сацыялістычнай уласнасці на сродкі вытворчасці ў форме дзяржаўнай (агульнанароднай) і калгасна-каапературнай уласнасці. Разам з тым мадыфікацыя тэкстаў Асноўных Законаў СССР і БССР, прыняцце нарматыўных прававых актаў, якія дазвалялі індывідуальную працоўную дзейнасць, прывялі да адмены забароны на атрыманне даходаў ад заняцця такой дзейнасцю і, як след, да спынення існавання грамадскіх адносін, што забяспечвалі ахову і функцыянаванне планавай эканомікі.

Яшчэ адным варыянтам выступае знікненне неабходнасці падвяргаць асобную групу грамадскіх адносін крымінальна-прававой ахове. Гэта можа быць абумоўлена у тым ліку з'яўленнем больш эфектыўных спосабаў абароны тых ці іншых адносін (нават не прававога характару), у сувязі з чым крымінальная ахова не будзе мець далейшай неабходнасці. Так, артыкул 139 КК БССР 1960 г. вызначаў у якасці злачынства парушэнне законаў аб аддзяленні царквы ад дзяржавы і школы ад царквы.

КК Рэспублікі Беларусь 1999 г. не прадугледжвае падобнага складу злачынства, але гэта не значыць, што грамадскія адносіны, у якіх рэалізуецца незалежнае функцыянаванне рэлігійных інстытутаў і дзяржавы, спынілі сваё існаванне. Асобныя парушэнні заканадаўства аб свабодзе веравызнанняў і рэлігійных арганізацый расцэньваюцца як адміністрацыйныя правапарушэнні, зыходзячы з чаго нельга казаць пра спыненне існавання грамадскіх адносін, што забяспечваюць аддзеленасць рэлігіі ад дзяржавы.

Пры гэтым адзначым, што суд, вызваляючы асобу ў сувязі са стратай дзеяннем грамадскай небяспекі па азначаных вышэй прычынах, ажыццяўляе ў нейкім сэнсе функцыю «адсейвання» складаў злачынстваў, прадугледжаных КК: крымінальны закон прадугледжвае той ці іншы склад злачынства, у той час як суд, вызнаючы прыцягненне да адказнасці за злачынства, прадугледжанае канкрэтным артыкулам КК, немэтазгодным па матыву страты дзеяннем грамадскай небяспекі з прычыны змянення абстаноўкі, прызнае разам з гэтым немэтазгоднасць знаходжання таго ці іншага складу злачынства ў Кодэксе, тым самым прызнаючы адсутнасць у дзеяння, каральнасць якога замацавана ў крымінальным законе, грамадскай небяспекі. Інакш кажучы, суд у такім выпадку выконвае функцыю практычнай дэкрыміналізацыі, чым фактычна канстатуе неабходнасць выключэння дзеяння, якое страціла злачыннасць, з КК.

2. Спыненне існавання ўмоў здзяйснення асобнага злачынства як накірунак змянення абстаноўкі заўжды праяўляецца ў дачыненні да канкрэтнага грамадска небяспечнага дзеяння, а само дзеянне на ўзроўні КК працягвае прызнавацца злачынным. Акрамя сітуацыі з адпадзеннем асаблівых умоў месца і часу злачыннага дзеяння, гэта могуць быць і змены, што маюць прамую сувязь з пацярпелым.

Напрыклад, паводле пастановы суда Драгічынскага раёна ад 05.01.2011 асуджаная А. вызвалена ад крымінальнай адказнасці па ч. 2 арт. 174 КК з прычыны змянення абстаноўкі ў сувязі са стратай дзеяннем грамадска небяспечнага характару. Суд прыйшоў да такой высновы таму, што былі ўстаноўлены факты ўсынаўлення дзіцяці і пагашэння запазычанасці па пакрыцці расходаў на яго ўтрыманне [4].

Названы накірунак змянення абстаноўкі можа рэалізоўвацца і ў выкананні патрабаванняў, што прад'яўляюцца заканадаўствам датычна да ажыццяўлення пэўных відаў гаспадарчай дзейнасці. Так, сельскагаспадарчы вытворчы кааператыў на працягу некалькіх гадоў ажыццяўляў без спецыяльнага дазволу (ліцэнзіі) спалучаную з атрыманнем даходу ў асабліва буйным памеры розьнічную рэалізацыю тавараў, нафтапрадуктаў, перавозку пасажыраў і грузаў аўтатранспартам і аказанне паслуг па пагрузачна-разгрузачных работах. Старшыні сельскагаспадарчага кааператыва прад'явілі абвінавачанне ва ўчыненні злачынства, прадугледжанага ч. 2 арт. 233 КК, аднак пастановай пракурора папярэдняе расследаванне па крымінальнай справе было спынена з прычыны страты дзеяннем грамадскай небяспекі, паколькі кааператыў на момант узбуджэння крымінальнай справы атрымаў спецыяльны дазвол (ліцэнзію), што патрабуецца на падставе заканадаўства аб ліцэнзаванні [5].

Адначасова з указанымі асаблівасцямі вызначэння змянення абстаноўкі ў мэтах прымянення падставы для вызвалення ад адказнасці, прадугледжанай арт. 87 КК, на ўзроўні пастановы Пленума Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь адсутнічаюць тлумачэнні, якія б дапамаглі ва ўніфікацыі судовай практыкі па гэтым пытанні, як і ў належным прымяненні палажэнняў названага артыкула (у прыватнасці, трактавання паняцця "змяненне абстаноўкі"), таму намі былі падрыхтаваны наступныя прапановы. У рамках пастановы Пленума «Аб практыцы прымянення судамі артыкулаў 86, 88, 89 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь, якія прадугледжваюць магчымасць вызвалення асобы ад крымінальнай адказнасці» разглядаем неабходным уключыць у назву і змест гэтай пастановы палажэнні аб прымяненні арт. 87, у прыватнасці наступныя:

1) Змяненне абстаноўкі можа мець дзве разнастайнасці: 1. карэнныя пераўтварэнні ладу жыцця грамадства, яго асобных сфер, якія могуць выяўляцца ў правядзенні эканамічных, палітычных і г.д. рэформ і 2. спыненне існавання ўмоў канкрэтнага злачынства. Змяненне абстаноўкі ў першай разнастайнасці тычыцца аб'екта злачынства, у другой – кампанентаў аб'ектыўнага боку (у прыватнасці, грамадска небяспечных наступстваў).

2) Змяненне абстаноўкі ў выглядзе карэнных пераўтварэнняў ладу жыцця грамадства можа выражацца як у спыненні існавання пэўных грамадскіх адносін, якія ахоўваюцца крымінальным законам (напрыклад, у выніку пераходу на рынкавую эканамічную сістэму), так і ў знікненні неабходнасці ўжываць крымінальна-прававую ахову датычна да пэўных грамадскіх адносін, у тым ліку у сувязі са з'яўленнем больш эфектыўных спосабаў іх абароны (напрыклад, адносіны ў галіне рэлігіі, камп'ютарнай бяспекі).

3) Спыненне існавання ўмоў пэўнага злачынства праяўляецца ў адпадзенні умоў месца і часу злачынства, нівеляванні злачынных наступстваў у дачыненні да пацярпелага, не прадугледжаных у іншых падставах вызвалення ад адказнасці або пакарання (напрыклад, устанаўленне фактаў ўсынаўлення дзіцяці, пагашэння расходаў на яго ўтрыманне), выкананні патрабаванняў заканадаўства ў сферы ажыццяўлення гаспадарчай дзейнасці да моманту прыцягнення да адказнасці і інш.

4) З прычыны сувязі паміж змяненнем абстаноўкі і аб’ектам злачынства варта замацаваць канкрэтны пералік структурных элементаў Кодэкса, пасля ўчынення злачынстваў, якія змяшчаюцца ў іх, суд не можа мець магчымасці канстатаваць змяненне абстаноўкі (датычна да страты дзеяннем грамадскай небяспекі) на падставе спецыфікі тых грамадскіх адносін, што складаюць аб’ект крымінальна-прававой аховы. Напрыклад, такімі злачынствамі могуць стаць злачынствы супраць чалавека, злачынствы супраць экалагічнай бяспекі і інш.